**УДК 39:338.48-6:502/504(476.5)**

# ПАТЭНЦЫЯЛ, ПЕРСПЕКТЫВЫ, МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў АГРАЭКАТУРЫЗМЕ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ) [1]

***Ю.С. ПРАКОФ’ЕВА***

**Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск**

*Паводле аналізу шырокага кола крыніц, у тым ліку вынікаў палявых этнаграфічных даследаванняў Беларускага Падзвіння ў 2005-2015 гг., устаноўлены высокі рэсурсны патэнцыял, абазначаны перспектывы і магчымасці выкарыстання традыцыйнай тэкстыльнай творчасці ў рэгіянальным аграэкатурызме.*

У сучасным беларускім грамадстве, далучаным да працэсу глабалізацыі, асаблівую навуковую і грамадскую значнасць набывае праблема захавання архетыпічных кодаў, забеспячэння пераемнасці і кантынуітэта ў развіцці культуры, эфектыўнай трансляцыі этнакультурнай спадчыны. Як паказалі вынікі агляду аналітычнай літаратуры і крыніц, у айчыннай гуманітарыстыцы пытанням выкарыстання аб’ектаў матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларусаў у агра- і экатурызме практычна не надавалася спецыяльнай увагі. Падзвінне да гэтага часу не з’яўлялася аб’ектам падобнага даследавання. У фокусе дадзенага артыкула знаходзіцца раскрыццё патэнцыялу, ацэнка перспектыў і магчымасцяў выкарыстання традыцыйнай тэкстыльнай творчасці ў аграэкатурыстычнай дзейнасці вывучаемага гістарычна-этнаграфічнага рэгіёну.

У канцы XIX – пачатку XX стст. асноўнай сыравінай для вырабу тканіны ў хатніх умовах з’яўляліся валакністыя расліны і воўна. Інтэнсіўнае развіццё льнаводства на поўначы Беларусі тлумачылася спрыяльнымі прыроднымі і кліматычнымі ўмовамі. Калі ў Расійскай імперыі збор льнянога валакна складаў 16–20 мільёнаў пудоў (56% валакна, якое атрымлівалі па ўсім свеце), то толькі на тэрыторыю сучаснай Віцебшчыны прыпадала каля 2 мільёнаў пудоў [9, с. 20]. Арганізатары Варшаўскай прамысловай выстаўкі ў 1858 г. адзначалі: «*месцамі скупкі рускага лёну як масленічнай, так і валакністай культуры з’яўляюцца Курляндыя, Пскоўская, Ліфляндская, Віцебская, Ковенская і Віленскія губерні. Тут атрымліваюць пераважна льняное насенне, якое ў Нямеччыне, Бельгіі і Францыі прадстаўляе вельмі высокі каштоўны матэрыял для пасеву*» [8, с. 80].

У дадзены перыяд на аснове хатняга рамяства пачалі развівацца кустарныя ткацкія промыслы. Гэтаму працэсу спрыяла стварэнне вучэбных ткацкіх майстэрняў, якія ўзбагацілі тэхналогію ткацтва, а значыць, і арнаментацыю тканін. Першая ткацкая школа на Беларусі ўзнікла ў Віцебскай губерні ў маёнтку Ганны Мооль у 1889 годзе і распаўсюдзіла свой уплыў на значную тэрыторыю Беларусі, Літвы і Латвіі. Пазней яна была пераведзена ў Рэжыцу (цяпер г. Рэзэкнэ ў Латвіі) [10, с. 31].

У першай дэкадзе XX ст. заходняя і ўсходняя часткі рэгіёна развіваліся ў непадобных сацыяльна-палітычных, эканамічных і культурных умовах, што не магло не адбіцца на рознай ступені захаванасці традыцыйнай тэкстыльнай творчасці. Заходняя частка Падзвіння з 1921 па 1939 гг. уваходзіла ў склад II Рэчы Паспалітай. У рэгіёне ў сялянскім побыце яшчэ шырока выкарыстоўваліся ільняныя тканіны хатняга вырабу. Было шырока распаўсюджана ткацтва, якое падтрымлівалася мясцовымі таварыствамі дапамогі народным промыслам. Пасля першай сусветнай вайны адрадзілася ткацкая майстэрня ў Друсвятах. Досыць актыўныя асяродкі ткацкага рамяства існавалі на тэрыторыі сучасных Верхнядзвінскага, Міёрскага, Шаркаўшчынскага, Пастаўскага раёнаў [14, с. 839]. На Верхнядзвіншчыне з канца 1960-х да сярэдзіны 1980-х гадоў працавала шмат ткачых-надомніц Верхнядзвінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. У 1980-я на Докшыччыне, Глыбоччыне, Браслаўшчыне таксама яшчэ актыўна працавалі асобныя ткачыхі, якія выраблялі пераборныя посцілкі і кілімы на замову [15, с. 107].

У заходняй частцы Беларускага Падзвіння напярэдадні Другой сусветнай вайны і асабліва ў 1950–1960-я гады распаўсюдзілася традыцыя вышываць насценныя дываны. Іх рабілі на пафарбаваным у чорны колер саматканым ільняным палатне, дзве полкі якога дзеля гэтага сшывалі паміж сабой. Для вышыўкі ўжывалі самапрадзеную пафарбаваную ў розныя колеры воўну. Вышыўка мела раслінна-кветкавы характар і дывановую кампазіцыю з акцэнтаваным цэнтрам, вугламі і бардзюрам. Дадзеная традыцыя ўзнікла не без уплыву моды на маляваныя дываны, якая ў азначаны час вельмі пашыралася ў сялянскім асяроддзі ў Заходняй Беларусі [12, с. 847–848]. Вышыўка шарсцянымі рознакаляровымі ніткамі выконвалася таксама па сетцы, якая плялася чоўнікам накшталт рыбалоўнай, вязалася кручком ці

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання праекта Беларускага фонда фундаментальных даследаванняў № Г15М-061 ад 4 мая 2015 г.

на раме. На чорным ажурным фоне сеткі выразна глядзяцца вышываныя насцілам геаметрычныя фігуры: ромбы, зоркі, крыжы, выявы кветак і галінак. Гэтыя дэкаратыўныя рэчы ўжывалі ў якасці насценных дываноў, посцілак на ложак, настольнікаў.

Як лакальную з'яву ў ткацтве заходняй часткі вывучаемага гістарычна-этнаграфічнага рэгіёну трэба адзначыць выраб на кроснах ходнікаў з ужываннем асновы з рознакаляровых нітак, саломы ці сітніку ва ўтку. Так, у в. Суднікі Браслаўскага раёна такое палатно ўжывалі для вырабу торб, з якімі хадзілі ў школу, царкву. Распаўсюджана было такое ткацтва на Верхнядзвіншчыне. У 1960–1970-я гг. гэту мясцовую традыцыю працягвалі на Верхнядзвінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў, дзе з ужываннем саломкі ткалі камплекты сурвэтак, дэкаратыўныя матывы [15, с. 107]. На тэрыторыі сучасных Докшыцкага і Верхнядзвінскага раёнаў выраблялі посцілкі, ходнікі, выкарыстоўваючы досыць рэдкую разнавіднасць васьмінітовага ткацтва – «*у восем нітоў па намерах*»[2], якая дазваляла атрымаць тканіну са складаным малюнкам і перапляценнем, падобным на жакардавае [5, с. 682].

З 1960-х гадоў у заходняй частцы Беларускага Падзвіння пад уплывам традыцый, запазычаных з захаду, пачалі ткаць «пасякі» – вясёлкавыя шарсцяныя посцілкі, якія тут называюць таксама «тынчёвікі» (Пастаўскі раён), «кракаўскія» (Глыбоцкі раён) ці, як і паўсюдна на Беларусі, «радугі». Іх выконваюць бясшоўнымі, ткуць адразу дзве столкі, запраўляючы дзеля гэтага ў кросны дзве асновы. Склаўся таксама варыянт посцілкі з рознакаляровымі палосамі, у цэнтры якіх змешчаны бардзюр з кветак. Такія посцілкі выраблялі пераважна на замову [14, с. 841].

Ва ўсходняй частцы, што ўваходзіла ў склад БССР, выраб тканіны ў хатніх умовах фактычна прыпыніўся ў перыяд калектывізацыі сельскай гаспадаркі. «*Як пачалася калектывізацыя, жэншчыны не выдзержывалі. Эта ж ад утра да ночы трэба было працаваць у калгасе. Дык якое ткацтва*?»[3] Адбываецца паступовае адмаўленне сярод вясковага насельніцтва ад тканін уласнай вытворчасці на карысць фабрычнаму тэкстылю. У 1930-я гады назіраецца заняпад шматнітовага ткацтва, пераважае выраб простага палатна, узорыстых ручнікоў, настольнікаў, тканін для адзення.

У выніку спусташэнняў, якія прынесла на Падзвінне Другая сусветная вайна, каштоўны пласт традыцыйнай матэрыяльнай культуры – узоры адзення і тэкстылю – месцамі амаль цалкам быў знішчаны. У раёнах, дзе ішлі найбольш буйнамаштабныя ваенныя дзеянні і меўся моцны партызанскі рух: Талачынскім, Чашніцкім, Ушацкім, Лепельскім, Сенненскім, Віцебскім, Полацкім, Лёзненскім, Расонскім, традыцыйныя тканіны амаль не захаваліся. «*Як вайна была, мама ўсе закапала на гародзе: і багоўкі, і посцілкі. Але ж нічога не захавалася. Палілі немцы усё...*»[4] .

Высокім рэсурсным патэнцыялам для сельскага турызму валодаюць лакальныя асаблівасці развіцця традыцыйнай тэкстыльнай творчасці. Так, рэдкі від ткацтва – «у пуплы» – зафіксаваны ў Сенненскім раёне. У гэтай тэхніцы выраблялі ваўняныя посцілкі, фактура іх мела петлі-пуплы, якія атрымліваліся ў працэсе ткання пры выцягванні вуточнай ніткі на добрую паверхню тканіны. Пуплы ўтвараюць контурны малюнак ромбаў, крыжоў, клетак, якія раўнамерна запаўняюць паверхню посцілак. Рэчы, вытканыя ў гэтай тэхніцы, выяўлены ў адзінкавых экзэмплярах, але ёсць падставы меркаваць, што ў XIX стагоддзі такі від ткання быў больш шырока распаўсюджаны ва ўсходніх раёнах Віцебшчыны. Магчыма, менавіта гэта тэхніка ўжывалася для вырабу посцілак з падобнай да апісанай вышэй арнаментыкай у памежнай з Віцебшчынай Пскоўскай губерні, у Порхаўскім павеце яна мела назву «хохолки» [14, с. 840–841].

Адной з рэгіянальных асаблівасцей народнага тэкстылю Падзвіння з'яўляецца шырокая распаўсюджанасць тут ажурных тканін, якія маюць назву «рэдчыкі». Ажурнае, нібы карункі, палатно, вытканае на ткацкім станку, ужывалі ў сялянскім побыце для настольнікаў, полагаў, фіранак «у кут» і на вокны. Нярэдкасць на Віцебшчыне і цалкам ажурныя без арнаменту ручнікі-набожнікі, якія сустракаюцца ў Гарадоцкім і іншых раёнах. Найбольш ажурных тканін канца XIX – першай паловы XX стст. даследчыкамі было зафіксавана ў Сенненскім, Бешанковіцкім, Лёзненскім, Гарадоцкім раенах Віцебскай вобласці У 40-я гады XX ст. ажурныя тканіны яшчэ ўжываліся ў сялянскім побыце ў якасці дэкаратыўных ручнікоў, абрусаў, посцілак [3, с. 89].

Паводле праведзенага ў межах праекту БРФФД даследавання ўстаноўлены наступныя формы (магчымасці) выкарыстання традыцыйнай тэкстыльнай творчасці ў аграэкатурыстычнай дзейнасці.

1) *дэманстрацыя этнаграфічных артэфактаў*, якія захаваліся ў сям'і гаспадароў сельскай сядзібы праз уключэнне традыцыйных тэкстыльных вырабаў у інтэр'ер (выяўлены два падыходы пры фарміраванні тэкстыльнага інтэр'еру: калькаванне традыцыйных прыёмаў афармлення жылой прасторы і гратэскная інтэрпрэтацыя) і стварэнне міні-музеяў (напрыклад, этнаграфічны музей «Поўсвіж» у аграсядзібе Васіля Шкіндзера, в. Вялікі Поўсвіж Лепельскага раёна). Найбольш распаўсюджанымі

[2] Запісана аўтарам у 2008 г. ад Паўленка Е.Е., 1922 г.н., в. Антонава, Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[3] Запісана аўтарам у 2009 г. ад Пісюковай В.У., 1936 г.н., в. Багатырскае, Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
[4] Запісана аўтарам у 2007 года ад Логінавай В.П. 1939 г.н., в. Арэшкава, Віцебкага раёна, Віцебскай вобласці.

элементамі, якімі дэкарыруюць сваю жылую прастору гаспадары сельскіх сядзібаў, з'яўляюцца вышытыя ручнікі, тканыя посцілкі, абрусы, дываны. Пры вылучаных падыходах прымяняюцца розныя прынцыпы ўпрыгожвання тэкстылем. Ручнік выступае найбольш яркай дамінантай тэкстыльнага інтэр'еру. Пры гратэскнай інтэрпрэтацыі вобразу дэкарыравання выкарыстоўваюцца асацыятыўныя кампазіцыі з арнаментальных элементаў.

2) *навучанне традыцыйным тэкстыльным рамёствам* праз майстар-класы, летнікі на базе сельскіх сядзібаў – дастаткова выніковая форма трансляцыі тэкстыльных традыцый. Напрыклад, у 2012 г. на базах дзвюх сельскіх сядзібаў Браслаўскага і Міёрскага раёнаў у рамках праекта «Выкарыстанне мясцовага патэнцыялу, як галоўнага рэсурсу для стварэння інавацыйнага турыстычнага прадукту» быў праведзены трэнінг выкарыстання льняных і ваўняных вырабаў у інтэр'еры. Пад эгідай грамадскага савета па развіцці агра- і экатурызму Міёрскага раёна з удзелам такога ж органа ў Браславе, прадстаўніцтва еўрарэгіёну «Азёрны край» штогод на аграсядзібе «Мацейкава сяліба» ў в. Перабродздзе Міёрскага раёна праводзіць рамесны летнік «Жывое святло» па вырабе рэчаў з лямцу [1, 6, 7, 12]. У сядзібе «Трабуцішкі» (в. Трабуцішкі, Пастаўскі раён) праводзяцца майстар-класы па кавальскім рамястве.

3) *распрацоўка сувенірнай прадукцыі.* Так, у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Вада, прырода і людзі ў знікаючым ландшафце. Развіццё ўстойлівага сельскага турызму ў Расіі і Беларусі» ў Лепельскім раёне была створана мабільная рамесная майстэрня. Майстры выцінанкі, ткацтва, вышыўкі аб'ядналіся ў творчую групу пад лагатыпам зялёнага маршруту «Край жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў», які аб'ядноўвае ў тым ліку шэраг сельскіх сядзібаў [13]. Мабільная рамесная майстэрня рэалізуе сувеніры ручной работы і праводзіць майстар-класы ў месцах пражывання турыстаў.

4) *выкарыстанне традыцыйнага касцюма (яго элементаў)* у анімацыйных праграмах. Трэба заўважыць, што на Падзвінні значна раней, у параўнанні з іншымі гістарычна-этнаграфічнымі рэгіёнамі, традыцыйны сялянскі строй выйшаў з ужытку. Даследчыкі адзначаюць асноўнай прычынай гэтага працэсу блізкасць расійскай сталіцы – асноўнага месца адыходніцтва актыўнага мужчынскага насельніцтва – выклікала у другой палове XIX ст. шырокае пранікненне ў вёску фабрычных тканін і гарадскіх відаў адзення, хуткую змену традыцыйнага касцюма агульнаеўрапейскім [2, с. 88]. Перадусім, у фальклорных і этнаграфічных крыніцах захаваліся апісанні лакальных традыцыйных строяў. М.Я. Нікіфароўскі, характарызуючы адзенне беларускага насельніцтва Падзвіння, адзначаў: "*На святочным адзенні можна бачыць такую тканіну, вытворчасць і апрацоўка якой могуць паспрачацца з фабрычнай, і не можаш паверыць, што яна зроблена таўстаскурымі пальцамі на грубым "кроснином ставу*" [11, с. 170].

Сярод іншага, на сучасным этапе ў сферы выкарыстання тэкстыльнай творчасці ў дзейнасці сельскіх сядзібаў назіраецца тэндэнцыя да эклектычнасці – запазычання культурных элементаў тэкстыльнай творчасці іншых этнічных супольнасцяў, у шэрагу выпадкаў пад сцягам беларускай культуры (у стварэнні стылізаванага дызайну інтэр'еру аграэкасядзібы, праз непрафесійны збор рэчаў у міні-музеях, выкарыстанне псеўданародных касцюмаў). Шырока распаўсюджанай дысфункцыяй у рэгёне з'яўляецца містыфікацыя (напрыклад, пры стварэнні і рэалізацыі сувенірнай прадукцыі шмат гаспадароў аграсядзібаў спрабуюць расшыфраваць турыстам сімволіку і семантыку традыцыйных тэкстыльных вырабаў (як паказваюць вынікі ўключанага назірання на рэгіянальных фестывалях, паводле матэрыялаў электронных сродкаў масавай інфармацыі, не заўсёды даставерных). Гэтыя і іншыя падобныя дзеянні дваіста ацэньваюцца этнолагамі (адны вучоныя лічаць, што гэта таксама праява сучаснай культуры, іншыя лічаць, што гэта недапушчальнае скажэнне традыцыйнай культуры). Прыведзеныя тыпы дысфункцыі павінныя быць папярэджаны, напрыклад у ходзе навучання ўладальнікаў сядзібаў, валанцёраў. Павінна быць прадастаўлена магчымасць правесці кансультацыі з экспертамі – этнографамі, фалькларыстамі, музейнымі спецыялістамі, якія маюць веды і добрае разуменне рэгіянальных асаблівасцяў традыцыйнай культуры. Гэта важна, паколькі дадзены від турызму карыстаецца сёння папулярнасцю не толькі сярод дарослых, але і сярод дзяцей і падлеткаў.

Такім чынам, перспектывы павышэння аграэкатурыстычнай прывабнасці гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну Беларускага Падзвіння наўпрост звязаны з пашырэннем выкарыстання рэсурсаў традыцыйнай тэкстыльнай творчасці. Комплекснае даследаванне мастацкіх, тэхналагічных, рытуальна-сімвалічных асаблівасцяў традыцыйнай тэкстыльнай творчасці беларусаў Падзвіння выяўляе высокую перспектыву для аднаўлення на сучасным этапе праз трансляцыю ў сельскім турызме з прыцягненнем мясцовых носьбітаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Басікірская, А. «Жывое цяпло» саграваe Перабродздзе [Электронный ресурс] / А. Басікірская // Міерскія навіны. – Режим доступа: http://www.2015.mijory.by/gosci/5848-zhivoe-teplo-sogrevaet-perebrode.html. – Дата доступа: 18.05.2015.
2. Бялявіна, В.М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М. Белявіна, Л.В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 303 с.:

іл.
3. Віннікава, М.М. Ажурныя тканіны Віцебшчыны / М.М. Віннікава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя даследаванні : зб. арт. / АН Бел. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; пад рэд. С.В. Марцэлева. – Мінск, 1989. – С. 89–92.
4. Винникова, М.Н. Народное узорное ткачество Беларуси конца XIX – начала XX века : дис. канд. искусствоведения : 17.00.04 / М.Н. Винникова. – Минск, 2001. – 113 с.
5. Віннікава, М.М. Народнае ткацтва Докшыцкага раёна / М.М. Віннікава // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Докшыцкі раён. – Мінск : 2004. – с. 680 – 684.
6. Вішнеўская, В. «Абапіраючыся на традыцыі…» [Электронный ресурс] / В. Вішнеўская // Міерскія навіны. – Режим доступа: http://www.2015.mijory.by/sport-i-turyzm/3003-opirayas-na-tradicii.html. – Дата доступа: 18.05.2016.
7. Вішнеўская, В. На полюсе творчасці ў Перабраддзі [Электронный ресурс] / В. Вішнеўская // Міерскія навіны. – Режим доступа: http://www.2015.mijory.by/main/2938-na-polyuse-tvorchestva-v-perebrode.html. – Дата доступа: 18.05.2008.
8. Лейснаре, И.А. Льноводство и льноводческие орудия в Латвии во второй половине XIX – начале XX в. / И.А. Лейснаре // Этнографическое картографирование материальной культуры народов Прибалтики. – М. : Наука, 1975. – С. 79–89.
9. Курилович, А.Н. Белорусское народное ткачество / А.Н. Курилович. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с., ил.
10. Лабачэўская, В.А. Вучэбныя ткацкія майстэрні на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. / В.А. Лабачэўская // Ткацтва : зб. матэрыялаў па бел. нар. ткацтву / уклад. В.А. Лабачэўская. – Мінск : БелІПК, 1999. – С. 31–41.
11. Никифировский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 338 с.
12. Озерный край: «Использование местного потенциала, как главного ресурса для создания инновационного турпродукта» [Электронный ресурс] // Еврорегионы Беларуси. – Режим доступа: http://beleuroregion.by/index.php?option=com_content&view=article&id=888%3A-l-r&catid=53%3Apraktika-sotrudnichestva&Itemid=157&lang=ru. – Дата доступа: 18.05.2008.
13. Осовская, Е. Мастерская на колесах [Электронный ресурс] / Е. Осовская // Лепельский край. – Режим доступа: http://www.lepel-kraj.by/?p=5307. – Дата доступа: 18.05.2008.
14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.] ; склад. Т.Б. Варфаламеева. Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
15. Трызна, Д.С. Верхнядзвінскае ткацтва / Д.С. Трызна // Этнаграфія Беларусі : энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 107.

## THE POTENTIAL, PERSPECTIVES, POSSIBILITIES OF USE OF TRADITIONAL TEXTILE CREATIVITY IN RURAL TOURISM (ACCORDING TO THE MATERIAL BELARUSIAN DVINA REGION)

***Y. PROKOFIEVA***

*According to the analysis of a wide range of sources, including the results of the field ethnographic research of the Belarusian Dvina region in 2005–2015, a high resource potential is established, prospects and the possibility of using of traditional textile art in the regional agro-ecotourism are identified.*

Polotsksu